*Пралетарыі ўсіх краін, яднайцеся!*

# Беларускі УНІВЕРСІТЭТ

**Орган парткома, рэктарата, мясцкома, камітэта ЛКСМБ і прафкома Беларускага дзяржаўнага універсітэта імя У. І. Леніна**

№ 16 (447) | Субота, 13 мая 1961 г. | Цана 1 кап.

## Сход камуністаў універсітэта

11 МАЯ АДБЫЎСЯ АГУЛЬНАЎНІВЕРСІТЭЦКІ ПАРТЫЙНЫ СХОД.

КАМУНІСТЫ АБМЕРКАВАЛІ ДАКЛАД САКРАТАРА ПАРТКОМА Р. В. БУЛАЦКАГА «АБ ВЫНІКАХ V ПЛЕНУМА ЦК КПБ І ЗАДАЧАХ ПАРТАРГАНІЗАЦЫІ ЎНІВЕРСІТЭТА».

## Яны ведалі Веру Харужую

Хто з нас не чуў пра гераічныя ўчынкі слаўнай дачкі беларускага народа, Героя Савецкага Саюза Веры Захараўны Харужай? Жыццё гэтай мужнай жанчыны, палымянага змагара за свабоду роднай Беларусі з'яўляецца для нас яркім прыкладам служэння сваёй Айчыне.

Жывую цікавасць знаходзіць у студэнтаў гістарычнага факультэта кожная вестка аб жыцці і дзейнасці Веры Захараўны. Вось чаму прапанова выкладчыка В. А. Мельцэра аб сустрэчы з баявымі саратнікамі патрыёткі, з людзьмі, якія ведалі яе, знайшла гарачы водгук сярод студэнтаў.

Да іх прыйшлі жаданыя госці—Мікалай Сямёнавіч Арэхва, былы сакратар ЦК КПЗБ, цяпер навуковы супрацоўнік інстытута гісторыі партыі пры ЦК КПБ, Васіль Захаравіч Корж, Герой Савецкага Саюза, генерал ў адстаўцы і Берта Лазараўна Штэймен—прадстаўнікі доблеснай камсамольскай плеяды, якая змагалася разам з Верай Харужай за шчасце народа. Аўдыторыя ледзь умясціла ўсіх жадаючых. Стаіць урачыстая цішыня.

На трыбуне—Мікалай Сямёнавіч Арэхва. Ён вядзе расказ аб дзіцячых і юнацкіх гадах гераіні, аб яе рабоце ў заходнебеларускім падполлі, аб слаўных справах чалавека вялікага сэрца і светлай мэты.

Аб баявых дзеяннях Веры Захараўны і яе мужа С. Г. Карнілава ў партызанскім атрадзе на Піншчыне расказаў Герой Савецкага Саюза В. З. Корж.

З цікаўнасцю слухаюць студэнты просты расказ былой палітзняволенай, цяпер персанальнай пенсіянеркі Б. Л. Штэймен аб падпольнай рабоце Веры Захараўны ў турме.

Як жывы, паўстае вобраз адважнай патрыёткі перад студэнтамі. Поўняцца гордасцю маладыя сэрцы за сваю зямлячку, прыгажэй становіцца жыццё на зямлі, за якое так самаадданa змагалася Вера Захараўна Харужая.

Сустрэча з баявымі саратнікамі гераіні надоўга застанецца ў памяці студэнтаў нашага факультэта. Гэта сустрэча дапамагла ім бліжэй пазнаёміцца з жыццём і дзейнасцю легендарнай дачкі народа.

**Н. КАЯН,**
**студэнт гістарычнага факультэта**

## Не толькі хімія важная

□

**Нататкі з экзамена**

□

*СТУДЭНТЫ аб'яднанай групы IV курса хімічнага факультэта здавалі днямі экзамен па дыялектычнаму матэрыялізму.*

*Што паказаў прайшоўшы экзамен?*

*Прафесар, доктар філасофскіх навук Васіль Іванавіч Сцяпанаў можа адказаць на гэтае пытанне станоўча: нягледзячы на малы тэрмін падрыхтоўкі, студэнты ўвогуле адказвалі добра. Былі, праўда, адзінкі...*

*Мы хочам сёння сказаць не толькі аб адзінках, але і аб тым, якое ўражанне застаецца, калі пабываеш на экзамене.*

*Адказвае выдатніца вучобы Валя Зайцава. Яна нядрэнна асвятляе пытанні, глыбока разбіраецца ў тэарэтычных пытаннях, але ёсць і ў яе хібы: напрыклад, не магла назваць ленінскага азначэння адносна перавагі практыкі над тэорыяй.*

*Добрая студэнтка Люся Паваразнюк не магла даць дакладнага адказу на пытанне, што такое «вечная ісціна».*

*Часта памылялася Ліля Тарноўская. Васіль Іванавіч справядліва паставіў ёй «тройку».*

*Добра адказвала Ніна Бальчэўская, якая прывяла рад прыкладаў з хіміі. Парадавалі сваімі адказамі на экзамене А. Шульга, Р. Гарбачова, Н. Кунцэвіч. Валя Акуліч ні толькі на «выдатна» здала прадмет, але і растлумачыла многае незразумелае сваім сяброўкам.*

*Наогул жа трэба сказаць, што на гэтым экзамене наглядалася нейкая раздвоенасць у дэманстрацыі сваіх ведаў студэнтамі (відаць дзейнічаў закон процілегласці). З аднаго боку, яны глыбока і дэталёва разбіраліся ў складаных пытаннях дыялектычнага матэрыялізму, а з другога — заблытваліся ў простых пытаннях, не прыводзілі прыкладаў. Але зачастую з дапамогай «выратавальнага круга»—падсказак прафесара Сцяпанава—студэнты выплывалі, нарэшце, на жаданы востраў сваіх няпэўных ведаў.*

*Здзівіў усіх адказ студэнта другой групы хімікаў, члена камітэта камсамола ўніверсітэта В. Коўгана. У экзаменацыйнай ведамасці перад яго прозвішчам стаіць «нездавальняюча». Да таго ж Коўган застаўся «даўжніком» і па замежнай мове.*

*Дзіна Сівуха і Міра Хмельніцкая таксама не блiснулі сваімі ведамі. «Здавальняюча» — вось што вынеслі яны ў сваіх залікоўках з экзамена.*

*Хочацца спыніцца і яшчэ на некаторых, чыста арганізацыйных пытаннях. Студэнты, якія відаць вельмі хваляваліся, штохвілінна заглядвалі ў дзверы, перашкаджалі сваім таварышам сканцэнтравацца, глыбока прадумаць пытанні білета.*

*Наогул жа абставіны экзамена былі даволі вольныя. Некаторыя студэнты заглядвалі ў канспекты і кнігі, якія яны папапрыносілі з сабою. Вядома, гэта не дае карысці, але студэнты тым самым прыніжалі сябе, па-зладзейску хаваліся ад выкладчыка.*

*Экзамен здан. Цяпер, калі гэта ўжо пройдзены этап, можна сказаць, што не ўсё яшчэ ў парадку з вывучэннем гэтай важнай дысцыпліны на такіх факультэтах, як хімічны. Студэнты павінны ўлічыць, што дыялектычны і гістарычны матэрыялізм—аснова нашага светапогляду. Гэта тая база, на якой стаіць перадавая савецкая навука.*

*Нідзе так не бачны законы дыялектычнага матэрыялізму, гаварыў Энгельс, як на прыкладах хіміі. А вось гэтага якраз не паказалі чацвёртакурснікі хімічнага факультэта.*

**Р. ЗАЛЕСКІ.**

## АГЛЯД-КОНКУРС НАСЦЕННЫХ ГАЗЕТ

На кожным факультэце ўніверсітэта выпускаецца адна, а то дзве-тры газеты. Гэта добрыя памочнікі партыйных арганізацый у барацьбе за высокую паспяховасць і дысцыпліну.

У сувязі з Днём друку ў нас прайшоў агляд-конкурс насценных газет. Першае месца і першая грашовая прэмія прысуджана «Савецкаму хіміку» (рэдактар **В. Сташонак**). Гэта газета мае добры аўтарскі актыў, шырока асвятляе жыццё факультэта і прыгожа, з густам афармляецца.

На другім месцы аказалася газета геаграфічнага факультэта «Географ» (рэдактар **Т. Злотнікава**) і «Спартсмен геафака» (рэдактар **В. Спірыдонаў**).

Газеце матэматыкаў «Рашым любую задачу» (рэдактар **Э. Смольскі**) прысуджана трэцяе месца.

Агляд-конкурс паказаў, што ўсе насценныя газеты сталі больш глыбока ўнікаць у жыццё сваіх факультэтаў, ставіць вострыя пытанні. Прыемна адзначыць таксама, што значнае месца ў газетах займаюць фотаздымкі.

За актыўны ўдзел у друку Граматай рэктарата ўзнагароджаны дацэнт фізфака **Г. Авечкін**, вярстальшчык друкарні **С. Сушынскі**, выкладчык гістфака **В. Мельцэр**, лінатыпістка **В. Гайваронская**, дацэнт філфака **І. Зазека**, супрацоўнік геаграфічнага факультэта **В. Спірыдонаў**, асістэнт хімфака **В. Сташонак**, студэнты **Л. Кузьміцкі**, **Т. Злотнікава**, **Э. Смольскі** і іншыя.

Актыўныя карэспандэнты шматтыражнай газеты «Беларускі ўніверсітэт» узнагароджаны грашовымі прэміямі. Сярод іх—**Л. Сянюта**, **І. Патапаў**, **Т. Харавец**, **В. Анцыфераў** і іншыя.



## Знаёмцеся: Ала Барташэвіч, *ВЫДАТНІЦА*

Хутка Ала Барташэвіч будзе здаваць шостую сесію ва ўніверсітэце. Прайшоўшыя пяць паказалі, што гэта здольная і старанная дзяўчына. Усе папярэднія экзамены яна здавала на «выдатна», толькі адзін раз на першым курсе дзяўчыне не «павязло». Яна атрымала «чацвёрку».

—Гэту сесію таксама думаю здаць на «выдатна»,—гаворыць Ала.

І ў гэтых яе словах чуецца ўпэўненасць і цвёрдасць.

Як вядома, у матэматыкаў прайшло раздзяленне на вылічальнікаў і тэарэтыкаў. Ала пайшла на тэарэтычны курс, бо тут большы палёт фантазіі. Ды шмат іншых прычын. Хто ведае— мабыць праз некалькі год гэта самая Ала Барташэвіч будзе вучоным, бо недзе там, у глыбіні душы, ёсць яшчэ акрэпшая мара...

Ала Барташэвіч з поспехам займаецца гімнастыкай, мае другі спартыўны разрад.

НА ЗДЫМКУ: Ала Барташэвіч, студэнтка III-га курса матфака.

Тэкст В. КОШАЛЯ.
Фота В. АНЦЫФЕРАВА.

≈⊙≈

### *У прафкоме БДУ*

## КАЛІ СТУДСАВЕТ ГАСПАДАР

У кастрычніку мінулага года нашы інтэрнаты ўключыліся ў спаборніцтва за лепшую арганізацыю быту, працы і адпачынку студэнтаў.

Калектывы інтэрнатаў увесь час працавалі над выкананнем умоў спаборніцтва. Лепш за ўсіх справіўся з гэтай задачай студсавет інтэрната № 4 па вуліцы Дзімітрава (старшыня студсавета У. Каравай, камендант Г. М. Рабцэвіч).

У інтэрнаце значна палепшылася санітарнае становішча жылых пакояў, калідораў, кухань.

Добра наладжана дзяжурства. Студсавет тут стаў сапраўдным гаспадаром.

Лепшым паверхам у інтэрнаце з'яўляецца другі, дзе жывуць географы. Гэтаму інтэрнату прысуджаны пераходны чырвоны сцяг і грашовая прэмія. У ленпакоі будзе ўстаноўлен тэлевізар.

Другое месца заняў інтэрнат, дзе жывуць матэматыкі. Тут студсавет і прафбюро працуюць зладжана, умела арганізуюць адпачынак студэнтаў у вольны час. Другі год праводзяцца круглагадовая спартакіяда.

Горш абстаяць справы з выкананнем умоў конкурса ў інтэрнатах фізікаў і філолагаў. Студсаветам гэтых інтэрнатаў трэба зрабіць пэўныя вывады, каб падцягнуцца да перадавых.

**А. ЦАЛКО,**
**старшыня прафкома.**

≈⊙≈

## *Нямецкія сябры ў Мінску*

Каля 300 грамадзян з Германскай Дэмакратычнай Рэспублікі пабывалі ў мінулы аўторак у Мінску. Гэта ў сталіцы Беларусі рабіў прыпынак чарговы «поезд дружбы». Госці ўсклалі вянкі ля помніка воінам і партызанам, загінуўшым у час Вялікай Айчыннай вайны.

**В. Налімаў.**

□

## У ВНУ нашай КРАІНЫ

## Палац навукі

Харкаўчане, праходзячы па цэнтральнай гарадской плошчы, любуюцца новым будынкам універсітэта імя А. М. Горкага. Па сваіх маштабах, па абсталяванню лабараторый ён з'яўляецца другім у краіне (пасля МДУ).

Скорасныя ліфты хутка праносяцца па ўсіх 14 паверхах. Залітыя святлом аўдыторыі, вялікія лекцыйныя залы, галярэі партрэтаў выдатных дзеячоў навукі. Сярод звычайных лабараторый паявіліся новыя: «Вылічальны цэнтр», «Лабараторыя ізатопаў» і іншыя.

Да апошняга часу Харкаўскі ўніверсітэт размяшчаўся ў 32 будынках, раскіданых у розных кутках горада. Цяпер уся ўніверсітэцкая «гаспадарка» будзе знаходзіцца ў адным будынку, плошча якога—56 тысяч квадратных метраў. У ім звыш двух з паловай тысяч памяшканняў, у тым ліку актавая зала на 1200 месц, дзве спартыўныя залы, інтэрнат на 800 месц. Ля сцен новага будынка—універсітэцкі батанічны сад.

## *Чытачы працягваюць размову*

# Ці праў прафесар Вінберг?

**У нашай газеце ад 14 сакавіка 1961 года быў надрукаван артыкул прафесара Г. Г. Вінберга «Супраць культу адзнакі», у якім ён выказаў свае меркаванні аб існуючым парадку назначэння стыпендыі і вядзення экзаменацыйнай сесіі. Сёння мы друкуем водгук дацэнта кафедры гісторыі КПСС М. Я. Гракава па гэтае выступленне.**

Імкнучыся расшырыць прапанову прафесара Кудраўцава аб неабходнасці карэнных змен у сістэме арганізацыі экзаменацыйных сесій у ВНУ, прафесар Г. Г. Вінберг выступае супраць прынцыпа размеркавання стыпендыі па паспяховасці. Ён лічыць яго неапраўданым «ні з выхаваўчага, ні з педагагічнага, ні з маральнага боку». На яго думку, гэта не толькі не садзейнічае, але нават перашкаджае паспяховай падрыхтоўцы высокакваліфікаваных кадраў, пазбаўляе выкладчыка свабоды дзеяння ў выстаўленні адзнак на экзаменах.

Каб разабрацца ў гэтым, патрэбна ясна прадстаўляць сабе, што такое стыпендыя, якая яе мэта і назначэнне.

Ва ўмовах савецкіх ВНУ стыпендыя—гэта, перш за ўсё, матэрыяльная дапамога дзяржавы студэнту ў перыяд яго вучобы, своеасаблівая зарплата. Гэта мера матэрыяльнага ўздзеяння на лодыраў і абібокаў. Гэта, нарэшце, рэшата, якое адсейвае не толькі лодыраў, але і людзей, якія не маюць патрэбнай падрыхтоўкі. Здаецца зусім ясна, што ўсё гэта прывучае людзей да працы, да добрасумленнага выканання свайго грамадскага абавязку.

Безумоўна, перад кожным выкладчыкам, як толькі ён бярэцца за ручку, каб паставіць студэнту адзнаку, асабліва, калі гутарка ідзе аб «тройцы», не гаворачы ўжо аб «двойцы», паўстае пытанне аб стыпендыі, і калі хочаце, аб далейшым знаходжанні студэнта ў ВНУ. А хіба ж не паўстануць такія пытанні перад выкладчыкам, калі стыпендыя не будзе звязана з адзнакамі. Безумоўна, паўстануць. Прафесар Вінберг зусім правільна гаворыць: тым, хто па тых ці іншых прычынах не могуць быць у ліку паспяваючых—не месца ў ВНУ. Адсейваюцца ж яны—па падставе адзнак, пастаўленых выкладчыкамі. Таму не зразумела, чаму прафесар Вінберг уяўляе выкладчыка свабодным у выстаўленні адзнак, калі стыпендыя не звязана з паспяховасцю, і пазбаўленым гэтага, калі назначэнне стыпендыі залежыць ад паспяховасці.

Аднак няма чаго грэху таіць. Залежнасць стыпендыі ад паспяховасці ў многіх выкладчыкаў вядзе да завышаных адзнак. Гэта з'ява ў жыцці ВНУ адзначана прафесарам Вінбергам правільна, але прычыны, якія абумоўліваюць яе, ён шукае не там, дзе яны знаходзяцца. У большасці выпадкаў гэта абумоўлена не прынцыпам размеркавання стыпендыі па паспяховасці, а суб'ектыўнымі фактарамі, слабахарактарнасцю некаторых выкладчыкаў, жаданнем «дапамагчы» аднаму ці некалькім студэнтам. Гэта, безумоўна, павышае аўтарытэт выкладчыкаў у вачах некаторай часткі студэнтаў, але гэта аўтарытэт не трывалы і не працяглы.

Адказ ад прынцыпа размеркавання стыпендыі па паспяховасці і замена яго ураўняльным паставіў бы ў аднолькавыя ўмовы добрасумленнага студэнта і лодыра. Гэта было б грубым парушэннем ленінскага прынцыпа асабістай матэрыяльнай зацікаўленнасці.

Я мала веру ў тое, што выпадкова можна праваліць экзамен ці шчасліва праскочыць на экзаменах. Кожная дысцыпліна, галіна навукі мае некалькі вузлавых праблем, без ведання якіх студэнт бездапаможны, бязграматны ў гэтай галіне навукі. Каб пераканацца ў гэтым, не трэба шмат працы і часу. І калі студэнт, не разбіраючыся ў гэтых вузлавых праблемах дысцыпліны, усё ж здае экзамен, то не ён шчасліва праскаквае, а яго праштурхоўваюць.

Сістэма арганізацыі экзаменацыйнай сесіі патрабуе вялікіх змен. Многае ў ёй устарэла, яго патрэбна адкінуць, замяніць новым. Але з прапановай прафесара Вінберга: адмовіцца ад назначэння стыпендыі ў залежнасці ад паспяховасці я не згодзен.

**М. Я. ГРАКАЎ,**
**дацэнт кафедры гісторыі КПСС.**

## ПРЫЗЁР РЫМСКАЙ АЛІМПІЯДЫ



**Шмат гадоў працуе на кафедры фізічнага выхавання і спорту Наум Давыдавіч Фінкінштэйн. За гэты час ён падрыхтаваў нямала спартсменаў, якія неаднаразова ўстанаўлівалі і паляпшалі рэспубліканскія і ўсесаюзныя рэкорды. Нядаўна яму прысвоена званне Заслужанага трэнера БССР.**

**Адным з лепшых яго выхаванцаў з'яўляецца студэнт хімічнага факультэта, прызёр Рымскай алімпіяды па трайному скачку Уладзімір Гараеў, якога вы бачыце на гэтым здымку. Зараз будучы хімік пад кіраўніцтвам свайго трэнера рыхтуецца да Алімпійскіх гульняў у Токіо.**

Фота В. АНЦЫФЕРАВА.

# Вершы Іосіфа Скурко

## Жыўнасць

Усё ж праслязілася неба.
Слязьмі ўмілавання з ваччу
Жывяць счарствелую глебу
Кроплі-слязіны дажджу.

Доўга чакалі знямела
Вільгаці-шчасця палі,
Каб каласамі шумела,
Перламі-зернем блішчэла
Праца на ўдзячнай зямлі.

Каб красавалі, квітнелі
Без пустацветаў сады,
Грудзі ад песень звінелі,
У сэрцах краналі лады.

Лёгка ўздыхнула прырода,
Кветкі жыцця ажылі.
Песень струіцца лагода,
Роджаных працай народа
Вечнавясенняй зямлі.

## Дарэмна

*Хай жыццёвая бура*
*гамоніць,*
*Няхай рве на шматкі*
*успаміны,*
*У жыцці вобраз твой*
*не загінуў —*
*Дотык рук адчуваюць*
*далоні.*
*Што гудкі цягнікоў*
*нам спявалі*
*Я запомніў жаданыя*
*песні.*
*І дарэмна цяпер*
*на прадвесні*
*Вочы зноў углядаюцца*
*ў далі.*
*Не вярнуць мне агню*
*твайго сэрца,*
*Ты другому дарыеш*
*світанні,*
*Што ідзеш да мяне*
*на спатканне —*
*Гэта хвораму суму*
*здаецца.*

# ПРАЦАЙ ЗДАБЫТЫЯ



НА ЗДЫМКУ: Альфрэд Мінкевіч.

# ВЕДЫ ТРЫВАЛЫЯ

*НАДЫХОДЗІЦЬ экзаменацыйная сесія. Цяжка прыходзіцца студэнту, які на працягу семестра не браўся за кнігу. Але вось усімі праўдамі і няпраўдамі экзамены здадзены.*

*— Усё, — вырашае студэнт,—з наступнага семестра бяруся за вучобу па-сапраўднаму...*

*Прайшлі канікулы. Хутка пралятаюць тыдні новага семестра, а студэнт нічым не займаецца акрамя таго, што (ў лепшым выпадку) наведвае лекцыі. І атрымліваецца, што да пачатку новай сесіі—старая карціна.*

*Як жа арганізаваць сваю працу, «прадоўжыць» свой рабочы дзень? Нічога складанага тут няма. Трэба толькі ўзяцца, але ўзяцца так, каб не адступіць.*

*Работа над кніжкаю для студэнта павінна прыносіць задавальненне. Толькі ў такім выпадку яна будзе прадуктыўнай. А то калі-ні-калі прыходзіцца чуць, што студэнт, маўляў, займаецца больш-менш акуратна, а вынікаў не відаць.*

*Я лічу, што студэнт павінен займацца тады, калі яму гэта хочацца. Вы скажаце: «А што, калі ў мяне такога жадання не бывае зусім?»—Такога быць не можа. Мы ж паступалі ва універсітэт, каб займацца навукай, авалодаць усімі яе тонкасцямі і дробязямі. І нежаданне займацца з'яўляецца толькі адгаворкай, несур'ёзнымі адносінамі да вучобы. Вазьміцеся за кніжкі—і вы ўбачыце, колькі ў навуцы яшчэ невысветленага, патрабуючага далейшага развіцця.*

### СЛОВА—ВЫДАТНІКУ

*Але для развіцця навукі патрэбна перш за ўсё вывучыць тое, што ўжо здабыта. У гэтых адносінах перад усімі студэнтамі адкрываюцца вялікія магчымасці. Вывучаць акружаючы нас свет ва ўсіх яго праяўленнях, унікаць глыбока ў філасофію прыродазнаўства, авалодаць сілаю логікі матэматычнага мыслення—што можа быць цікавей? Нішто не можа прынесці большага задавальнення, чым глыбокія веды, здабытыя ва ўпорнай працы над сабою.*

*У многім перашкаджае студэнтам перагрузка вучэбных планаў. Бывае, прыходзіцца займацца ў дзень па 10—12 гадзін. Тады для самастойнай працы, безумоўна, не хапае часу. Пабольш патрэбна было б удзяляць увагі правядзенню семінараў, практычных заняткаў, таму што ў час сесій, якія з'яўляюцца, па сутнасці, пакуль асноўнымі паказчыкамі паспяховасці студэнтаў, выкладчыку цяжка выявіць здольнасці і веды студэнта.*

*Але пры любых умовах студэнт павінен удзяляць значную ўвагу самастойным заняткам. Пабольш упэўненасці ў сябе—і вы дасягнеце добрых вынікаў!*

**А. МІНКЕВІЧ,**
**студэнт III-га курса фізічнага факультэта.**

# ДАРОГА Ў НАВУКУ

Усе апошнія дасягненні навукі і тэхнікі так ці інакш звязаны з небывала бурным развіццём фізікі. У гэтай галіне савецкія вучоныя дасягнулі грандыёзных поспехаў.

Далейшае развіццё навукі і тэхнікі звязана з падрыхтоўкай высокакваліфікаваных кадраў маладых спецыялістаў. Важную ролю ў гэтай справе адыгрывае своечасовае ўцягненне студэнтаў у навуковую работу.

Да цяперашняга часу ў сувязі з недахопам месца на фізічным факультэце ўзніклі сур'ёзныя цяжкасці ў арганізацыі гурткоў на малодшых курсах, што, вядома, зніжае якасць навукова-даследчай работы на факультэце.

Тым не менш, большасць выкананых курсавых і дыпломных работ прадстаўляе нямалую каштоўнасць. Многія работы студэнтаў 4—5 курсаў мінулага года ўдастоены першай і другой катэгорыі на аглядзе студэнцкіх работ, а некаторыя з іх прадстаўлены да друкавання ў навуковых часопісах.

Паспяхова працуюць студэнты чацвёртага і пятага курса і ў бягучым годзе. Нядаўна на навуковай канферэнцыі ў Рызе студэнты V курса Ткачоў (навуковы кіраўнік праф. І. Р. Некрашэвіч), Янусік і Зяцькова (навуковы кіраўнік кандыдат фізіка-матэматычных навук Г. В. Авечкін) прачыталі даклады, якія атрымалі высокую ацэнку. З дакладам у Адэсе выступіў студэнт IV курса Барышэўскі (навуковы кіраўнік праф. Фішэр).

На прайшоўшую нядаўна студэнцкую навуковую канферэнцыю было прадстаўлена чатырнаццаць цікавых дакладаў.

Прыемна адзначыць, што некаторыя студэнты працуюць у сумежных галінах. Прымяненнем радыёэлектронікі ў фізіялогіі займаюцца студэнты IV курса Л. Бухцілаў і Р. Лемеш.

**Старшыня савета СНТ фізічнага факультэта Б. БЕРКОЎСКІ.**

□

*ШАХМАТЫ*

ЗАДАЧА-МІНІЯЦЮРА

**Я. Ляхаў**



Мат у 2 хады.

# Гумар

—Чаму вы заехалі ў сад? — спытаў міліцыянер у веласіпедыста. — Тут жа ясна напісана: «Язда на веласіпедах забаронена! Што вы, чытаць не ўмееце?»

— Чытаць-то я ўмею, але не ўмею спыняць веласіпед.

* * *

—Прыязджай да мяне ў вёску,—запрашаў студэнт свайго сябра.—Лес, рэчка.... Пагуляеш, адпачнеш.

—Дзякую! Прыеду. А які ў цябе адрас?

— Ну, навошта такая цырымонія? Прыязджай запраста. Без адраса.

Старшыня спартыўнага клуба сказаў:

—У іншых спартыўных клубах 50 працэнтаў членаў узмоцнена трэніруюцца, а астатнія нічога не робяць. Я шчаслівы далажыць вам, што ў нас гэта якраз наадварот.

* * *

—Ты добра ездзіш на веласіпедзе?

—Як маланка.

—Так хутка?!

—Не. Зігзагамі..

* * *

**СКАРГА РЫБАЛОВА**

— Ну, што за дзень выдаўся! Ёрш, і той клюе не па-чалавечы.

**Рэдактар М. ЦІКОЦКІ.**

НАШ АДРАС:
**Мінск,**
**Універсітэцкі гарадок,**
**біякорпус, 31.**
**Тэлефон: 2-07-19.**
Друкарня выдавецтва
БДУ імя Ул. І. Леніна

*АТ 04358.* *Зак. 1142.*